ГЛЯДЗІЦЕ, ХТО ПРЫЙШОЎ!

18 лютага адбыліся выбары ў мясцовыя Саветы дэпутатаў. «МС» вырашыла пазнаёміць сваіх чытачоў з учарашнімі кандыдатамі, а сёння ўжо паўнапраўнымі дэпутатамі, прадстаўнікамі органаў мясцовага самакіравання 28-га склікання. Менавіта ад іх намаганняў у многім залежыць, якім будзе заўтра наша жыццё. Ім — слова.

«Нас заўсёды лёгка знайсці»

Галіне БЯЛЯЕВАЙ, завучу магілёўскай СШ № 34, у панядзелак патэлефанавалі і павіншавалі з тым, што яна зноў стала дэпутатам Магілёўскага гарсавета. Гэта будзе ўжо другі яе тэрмін. Тое, што жыхары Кастрычніцкай выбарчай акругі № 32 зноў даверылі Бяляевай абараняць іх інтарэсы, надае ўпэўненасці і пацвярджае выніковасць яе работы ў мінулым скліканні.

— Ад дэпутатаў шмат што залежыць, напрыклад, у размеркаванні бюджэту горада, — кажа Галіна Бяляева. — Вельмі хочацца завяршыць тое, што было распачата народнымі абраннікамі папярэдніх скліканняў — маштабную рэканструкцыю радзільні гарадской бальніцы хуткай медыцынскай дапамогі, будаўніцтва дзіцячага садка ў Казіміраўцы, рэканструкцыю дарожнай сеткі і гэтак далей.

Буду працягваць работу па зваротах жыхароў акругі. Планую неўзабаве выступіць перад сваімі выбаршчыкамі ў працоўных калектывах — пра месца і час гэтых сустрэч будзе заяўлена ў лістоўках, якія плануецца размясціць на інфармацыйных стэндах.

Летась, напрыклад, атрымалася зрушыць з месца пытанне асвятлення ў «спальным» раёне маёй мікразоны. Прыемна, што людзі адразу ж адзначылі: гэта заслуга дэпутатаў. Не менш прыемна было працаваць з ЖЭУ № 12 — даводзілася часта звяртацца туды з праблемамі насельніцтва, і там заўсёды аператыўна рэагавалі.

Вельмі часта людзі памылкова лічаць, што менавіта дэпутат павінен да іх прыйсці і прапанаваць сваю дапамогу. Але калі ў акрузе жыве 8 тысяч чалавек, як можна дайсці да кожнага? Дэпутаты ні ад каго не хаваюцца. Нас можна заўсёды знайсці і праз сайт Савета дэпутатаў, і праз сродкі масавай інфармацыі, і праз інфармацыйныя лістоўкі.

«Абяцаў — і выканаю!»

Віталь ЧАЙКІН, маёр унутранай службы, начальнік Лёзненскага РАНС, дэпутат раённага Савета ўжо ў другім скліканні. Яго прынцып у дэпутацкай дзейнасці: «Абяцаў — выканай!»

— Лічу, што дэпутат павінен выконваць тое, што абяцаў падчас перадвыбарнай кампаніі. І гэта не дзеля прыгожага слова кажу. Тое, што магу зрабіць, абавязкова зраблю, наколькі гэта магчыма. І, паверце, сам вазьму граблі, рыдлёўку і ў вольны ад службы час папрацую. Калі першы раз стаў дэпутатам, зрабіў тры пляцоўкі для дзіцячых гульняў. Вядома, не адзін. І ў будучыні звярнуся па дапамогу, напрыклад, да работнікаў ЖКГ. Пісаць лісты ў выканкам, да кагосьці падыходзіць — гэтым, зразумела, трэба карыстацца, каб рабіць нешта для людзей. Але і самому многае можна зрушыць з месца. І калі кожны прадстаўнік дэпутацкага корпуса захоча нешта зрабіць для людзей, гэта ўжо будзе добра. Я выбаршчыкам паабяцаў, што ў першы год сваёй дэпутацкай працы зраблю дзіцячую пляцоўку ў райцэнтры: з калегамі, аднадумцамі, работнікамі ЖКГ. Сёння ж там толькі адна горка... Далей — па абставінах.

Народны абраннік падкрэсліў, што пытанні добраўпарадкавання вельмі хвалююць людзей. Некалькі гадоў таму ён з калегамі ў вёсцы Добрамыслі браў удзел у добраўпарадкаванні крыніцы. Цяпер сюды прыязджаюць па ваду нават з суседняй Расіі.

«Трэба знаходзіць кампраміс»

Аляксей ГВІЛАВА, намеснік камандзіра 5-й асобнай брыгады спецыяльнага прызначэння, дэпутат Пухавіцкага раённага Савета і Мінскага абласнога Савета, балатаваўся ў дэпутаты ўпершыню. Чатыры гады таму, калі ўдзельнічаў у падрыхтоўцы выбарчай кампаніі ў мясцовыя Саветы дэпутатаў, задумаўся: а чаму б не вылучыць сваю кандыдатуру наступны раз? Хацелася зрабіць нешта карыснае для людзей, горада, каб потым было чым ганарыцца. У гэтым яго падтрымала і жонка, якая таксама носіць пагоны.

— Вядома, хваляваўся: ці змагу данесці да людзей сваю пазіцыю як кандыдат у дэпутаты? Ці падтрымаюць яны мяне? Жыхары перш за ўсё заклапочаны надзённымі канкрэтнымі праблемамі свайго горада, раёна: паляпшэннем работы жыллёва-камунальнай гаспадаркі, уладкаваннем дарог, асвятленнем вуліц і населеных пунктаў. Усе пытанні адначасова не вырашыш, яны патрабуюць паступовай і спакойнай работы. І тыя, хто падтрымаў маю кандыдатуру, гэта добра разумеюць. Людзей цікавіць таксама, як будуць развівацца спартыўная інфраструктура, сетка дзіцячых садкоў. Тут сацыяльныя стандарты захаваныя, але чалавеку, вядома, хочацца, каб дашкольная ўстанова была непадалёку ад дома. Людзі выказвалі свае думкі, як палепшыць транспартныя зносіны і ў самой Мар'інай Горцы, і са сталіцай, паколькі многія ездзяць туды працаваць.

Я не абяцаў, як кажуць, малочных рэк і кісельных берагоў, таму што гэта было б несумленна з майго боку. Абяцаў адно: буду прыкладаць усе намаганні, з улікам паўнамоцтваў мясцовых Саветаў дэпутатаў, каб жыццё палепшылася.

Мясцовыя Саветы павінны працаваць у цеснай звязцы з выканаўчай уладай. Калі кожны будзе цягнуць коўдру на сябе, то не атрымаем ніякага выніку. Вядома, на сесіях кожны з дэпутатаў адстойвае інтарэсы сваіх выбаршчыкаў. Лічу, трэба знаходзіць кампраміс, пункты судакранання: дзе і што перш за ўсё неабходна ўладкаваць. Ёсць шмат пытанняў, якія можна вырашаць без значных фінансавых затрат. У прыватнасці, добраўпарадкаванне, што, па сутнасці, павінен рабіць кожны на сваім рабочым месцы.

У нас ёсць задума зрабіць алею Славы, прысвечаную воінскім часцям, якія ў розныя часы знаходзіліся ў Мар'інай Горцы. Адна справа—калі займаешся гэтым на ўзроўні воінскага фарміравання. Іншая—калі прымуць удзел самі жыхары. Спадзяёмся, што ўсё ў нас атрымаецца, а бюджэтныя сродкі траціць не давядзецца, бо ў горадзе ёсць нераўнадушныя да сваёй гісторыі людзі. Чакаць, што нехта дасць шмат грошай, і тады, маўляў, зажывём—гэта няправільна. Мы самі павінны ўдзельнічаць у грамадскім жыцці горада і раёна.

«Вуліцы чакаюць рамонту»

Старшыня Буда-Кашалёўскага раённага Савета дэпутатаў Алена АЛЕКСІНА ўпершыню абрана ў абласны Савет дэпутатаў, а вось у раённым яна будзе працаваць ужо чацвёрты тэрмін. Дарэчы, першы раз пакаштаваць хлеб народнага абранніка ёй давялося яшчэ ў 18 гадоў, калі дзяўчыну абралі дэпутатам раённага Савета ў Чыгуначным раёне Гомеля. 10 гадоў Алена Іванаўна ўзначальвае дэпутацкі корпус у Буда-Кашалёўскім раёне.

— На абласным узроўні буду імкнуцца вырашыць праблемы, якія сёння існуюць у маёй выбарчай акрузе.

Па-першае, гэта стан дарог. Размова ідзе ў першую чаргу пра вясковыя вуліцы. Сапраўды, многія з іх патрабуюць бягучага рамонту.

Па-другое: у раёне патрэбны яшчэ станцыі абезжалезвання вады. Людзі сёння скардзяцца, што не могуць выкарыстоўваць сучасную тэхніку з-за вады з вялікай колькасцю жалеза.

У першую чаргу трэба забяспечыць якаснай вадой жыхароў пасёлка Уваравічы і іншых вёсак у Буда-Кашалёўскім раёне. Ёсць дзяржаўная праграма па будаўніцтве станцый абезжалезвання. Важна, каб мы трапілі ў фінансаванне па гэтай праграме.

Па-трэцяе, для таго, каб у сельскіх населеных пунктах затрымлівалася моладзь, ствараліся сем'і і нараджаліся дзеці, трэба на ўзроўні падтрымліваць аб'екты сацкультбыту. Таму ў аграгарадку Камунар неабходна закончыць рамонт Дома культуры і ўцяпленне дзіцячага садка. А яшчэ знайсці дадатковае фінансаванне, каб адрамантаваць памяшканне Дома культуры ў аграгарадку Пянчын.

«Работа дэпутата — гэта айсберг»

У новы склад Гродзенскага гарадскога Савета дэпутатаў увайшла старшыня абласнога камітэта прафсаюза работнікаў дзяржаўных устаноў Алена БЕРАСНЕВА. Двойчы Алена Пятроўна паспяхова балатавалася ў абласны Савет, а з 2012 па 2016 год прадстаўляла горад Гродна ў беларускім парламенце. Гродзенцы ведаюць Алену Берасневу і як прафесійнага журналіста — некалькі гадоў яна вяла на абласной тэлестудыі папулярную праграму «Вячэрні Гродна», а затым сем гадоў працавала галоўным рэдактарам газеты «Гродзенская праўда».

— Падчас сёлетняй кампаніі мы праводзілі пікет па вуліцы Дзяржынскага. У цэлым людзі ставіліся да гэтага добразычліва. Раптам падыходзіць мужчына і адразу з прэтэнзіяй — вы, дэпутаты, чым вы дапаможаце? Аказваецца, ён мае праблемы з сэрцам, а ў паліклініцы не змог запісацца на прыём — вялікія чэргі. Патэлефанавала сваёй калезе, якая балатавалася ў абласны Савет, — яна медык, узначальвае дзіцячую паліклініку. Я ёй перадала нумар тэлефона і прозвішча гэтага чалавека, папрасіла неяк дапамагчы... А ўжо перад выбарамі зноў падыходзіць гэты мужчына — з кардыяманіторам (гэты прыбор кантралюе работу сэрца, і зараз мужчына праходзіць абследаванне). Ён быў вельмі здзіўлены, што яму патэлефанавалі і вырашылі яго праблему. Гэта гаворыць аб кансалідацыі паміж дэпутатамі.

Аўтарытэт дэпутат заваёўвае сам. Можа, хто сутыкнуўся з абыякавымі адносінамі з боку народнага абранніка, — тады ён будзе лічыць, што такія ўсе дэпутаты. А наогул работа дэпутата — гэта айсберг, які відаць толькі часткова, большая частка яго схавана пад вадой. Усе спрэчкі, высілкі застаюцца «за кадрам», людзі пра іх не ведаюць.

Як прадстаўніка прафсаюзаў, мяне хвалююць такія пытанні, як тэхніка бяспекі, заключэнне калектыўных дагавораў, якія паляпшаюць умовы працы. Аспектаў шмат, мы думаем, што гэтыя пытанні прыярытэтныя не толькі для прафсаюзаў. Важна, каб яны разглядаліся на пасяджэннях выканаўчай улады. Каб адпаведныя рашэнні прымаліся на пасяджэннях раённага ці гарадскога Саветаў дэпутатаў. Таму прысутнасць прафсаюзных лідараў у такіх структурах мае немалаважнае значэнне.

Многіх дэпутатаў ужо ведаюць па іх папярэдніх справах. Водгукі аб рабоце Савета мінулага склікання можна назваць станоўчымі, упэўнена, што і новая каманда будзе такой жа дружнай і аўтарытэтнай.

Старонку падрыхтавалі Ірына АСТАШКЕВІЧ, Нэлі ЗІГУЛЯ, Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ, Аляксандр ПУКШАНСКІ, Маргарыта УШКЕВІЧ.